Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 6. Варыянт 3**

**Білет 6. Практычнае заданне. Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР у другой палове 1940-х - 1980-я гг.**

**Заданні склаў:**Савяня Андрэй Васільевіч, намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце, настаўнік гісторыі і грамадазнаўства ДУА «Краснабярэжская сярэдняя школа Жлобінскага раёна»

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні:**

1. Ацэніце гістарычнае значэнне ўваходжання БССР у склад ААН у якасці аднаго з заснавальнікаў і падпісанне Статута ААН кіраўніком дэлегацыі наркамам замежных спраў БССР К.Кісялёвым.
2. Як змянілася колькасць КПБ з 1940-х па 1980-я гг.?
3. Вядома, што на мяжы 1980-х - 1990-х гг. колькасць КПБ стала рэзка падаць. З чым гэта было зьвязана?
4. На аснове аналізу Канстытуцыі БССР 1978 г. вызначыце асноўныя органы ўлады ў БССР, іх месца і ролю ў грамадска-палітычным жыцці краіны

**Крыніца І. Кузьма Кісялёў падпісвае Статут ААН 26 чэрвеня 1945 года.**



**Крыніца ІІ. Артыкулы Канстытуцыі БССР 1978 г/.**

Артыкул 6. Кіруючай і накіроўваючай сілай савецкага грамадства, ядром яго палітычнай сістэмы, дзяржаўных і грамадскіх арганізацый з'яўляецца Камуністычная партыя Савецкага Саюза. КПСС існуе для народа і служыць народу.

Артыкул 97. Вышэйшым пастаянна дзеючым органам дзяржаўнай улады Беларускай ССР з'яўляецца Вярхоўны Савет Беларускай ССР. Артыкул 115. Савет Міністраў Беларускай ССР - Урад Беларускай ССР - з'яўляецца вышэйшым выканаўчым і распарадчым органам дзяржаўнай улады Беларускай ССР.

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі
Артыкул 124. Органамі дзяржаўнай улады ў абласцях, раёнах, гарадах, раёнах у гарадах, пасёлках, сельскіх населеных пунктах з'яўляюцца адпаведныя Саветы народных дэпутатаў.

**Крыніца III. Колькасць КПБ**

| Год | Количество членов |
|---|---|
| 1946 г. | 48, 2 тысяч человек |
| 1955 г. | 145 тысяч человек |
| 1964 г | 266 тысяч человек |
| 1986 г. | 670 тысяч человек |

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Адказы:**

**1.**26 чэрвеня 1945г. дэлегацыя БССР на чале з наркамам замежных спраў К.Кісялёвым падпісала Статут Усеагульнай міжнароднай арганізацыі па падтрыманні міру і бяспекі. На падставе таго, што 27 красавіка 1945 г. Міжнародная канферэнцыя ў Сан-Францыска, створаная для ўтварэння ААН, прыняла рашэнне аб уключэнні БССР у лік краін-заснавальніц гэтай арганізацыі. Гэта сведчыць аб прызнанні БССР як роўнага суб'екта міжнароднай палітыкі.

**2.**Колькасць сябраў КПБ павялічылася з 1946 г. па 1986г. на 621,8 тысячы чалавек. У СССР і БССР у разгляданы перыяд існавала аднапартыйная палітычная сістэма. КПБ была кіруючай і накіроўваючай сілай у грамадстве. Яна поўнасцю кантралявала ўсе сферы жыцця грамадства. У разгляданы перыяд у БССР быць камуністам азначала быць сапраўдным грамадзянінам і патрыётам сваёй краіны.

**3.**У 1985г. Генеральным сакратаром ЦК КПСС быў абраны М.С. Гарбачоў. Ён пачаў праводзіць палітыку "перабудовы". У гэты перыяд стала фармавацца шматпартыйнасць. З'явіліся розныя грамадска-палітычныя рухі і арганізацыі, новыя палітычныя партыі. Аўтарытэт і ўплыў КПБ імкліва падалі. У 1990г. трэці Пазачарговы з'езд народных дэпутатаў СССР адмяніў шосты артыкул Канстытуцыі СССР, у якім замацоўвалася кіруючая і накіроўваючая роля КПСС.

**4.**Згодна з асноўным законам краіны вышэйшым органам улады з'яўляўся Вярхоўны Савет БССР, якому належала заканадаўчая дзейнасць. Выканаўчая ўлада належала Савету Міністраў БССР. Гэтыя органы праводзілі свае законы ў жыццё з дапамогай Саветаў народных дэпутатаў, якія былі ім падпарадкаваны і павінны былі ўкараняць у шырокія масы распараджэнні вышэйстаячых органаў. Але, нягледзячы на наяўнасць канстытуцыі, галоўную ролю ў краіне адыгрывала камуністычная партыя, усе загады якой абавязаны былі выконваць як цэнтральныя, так і мясцовыя органы ўлады. Менавіта кампартыі належала ўся ўлада ў краіне, і менавіта яна прымала рашэньні на ўсе праблемы ключавога характару ў дзяржаве. Прадстаўнікі кампартыі займалі адказныя месцы ў вышэйшых органах заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады і паслухмяна выконвалі распараджэнні партыі.